

***

Юбілейныя даты заўсёды прыцягваюць увагу, і не толькі новымі даследаваннямі, фактамі, успамінамі, але і тым, што было вядома раней, бо час многаму надае новыя сэнсы, акрэслівае вартасць, пацвярджае каштоўнасць. Яркім прыкладам таму можа служыць 110-годдзе Максіма Танка. Публікацыі да юбілею гэтага выдатнага творцы, класіка беларускай паэзіі зацікавілі і вучняў, спрыяла таму з'яўленне новай чырвонай даты на нашым календары – **17 верасня.** Ды яшчэ такое знакавае супадзенне: Максім Танк нарадзіўся таксама 17 верасня. Адзін з вучняў Прышчэпчык Святланы Пятроўны, настаўніцы СШ № 12 імя В. У. Бабко г. Гродна, Салдаценка Віктар (9 «Б» клас) зцікавіўся дзённікам паэта «Лісткі календара». Яго ўразіла політэматычнасць пісьменніцкага дзённіка, натхніла на даследаванне. Традыцыйна падтрымліваючы юных даследчыкаў, мы прадстаўляем творчую працу Віктара Салдаценкі вашай увазе.

Алена РУЦКАЯ

# Політэматычны характар дзённіка Максіма Танка «Лісткі календара»



Аўтар работы:
Салдаценка Віктар, 9 «Б» клас СШ № 12
імя В. У. Бабко г. Гродна

Дзённікі, як і ўспаміны, і гістарычныя крыніцы, з'яўляюцца каштоўнымі дакументамі часу для даследчыкаў і не толькі. На сённяшні дзень літаратура факта, пазбаўленая вымыслу, не прыдумая, якая адлюстроўвае рэальнасць і передае досвед тых, што былі сведкамі і непасрэднымі ўдзельнікамі пэўных падзей, прыцягвае найбольшую ўвагу. Не выключэнне і дзённікі Максіма Танка, якія ён вёў усё сваё творчае жыццё. Гісторыя і час наканавалі Максіму Танку стаць удзельнікам і сведкам шматлікіх падзей: трагічных, трывожных, лёсавызначальных.

У міжваенным перыядзе (1921 - 1939) Вільня, дзе жыў, вучыўся і працаваў на той час Максім Танк была палітычным і культурным цэнтрам Заходняй Беларусі. Тут знаходзіліся сядзібы ўсіх беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый, працавалі беларуская гімназія, беларускі музей, шэраг навуковых і культурна-асветных устаноў, рэдакцыі газет і часопісаў. У Заходняй Беларусі разгарнуўся шырокі нацыянальна-вызваленчы рух. У гушчы тых падзей апынуўся таленавіты юнак, пачынаючы выдатны паэт. Ён ішоў сцежкамі змагання і гэта гартавала яго як асобу і як паэта. "Цяжка ўявіць сабе ўвесь трагізм тых год", – пісаў ён у прадмове да дзённіка і адзначаў, што ўжо ў 1935 годзе, з якога пачынаюцца запісы "Лісткоў календара", яму было крыху лягчэй, бо быў ужо на легальным становішчы і "ад усіх нягод, хоць на кароткі час, мог знайсці прыстанішча ў паэзіі – краіне, непадкантрольнай паліцыі" [6, с.10] (тут і далей цытаванне ажыццяўляецца па шасцітомным Зборы твораў (1981г.).

Першы запіс, які пазначаны датай 7-га студзеня 1935 года, пачынаўся радкамі: "Лісткі майго календара ўвесь час перагортвае і шматае навальнічны вецер. Цяжка па такім календары жыць" [6, с.11]. У гэтым можна пераканацца, чытаючы запісы паэтавых думак і назіранняў за палітычнымі падзеямі не толькі ў Вільні, але і ў свеце. Максім Танк піша:

10/VIII. *Зноў "Наша воля" выйшла з белымі плямамі, зняты артыкул Рыгора Шырмы "Мы за абарону міру". На першай старонцы засталася толькі "Адозва Сусветнага кангрэсу міру". А ў Іспаніі ўсё шырэй разгараецца полымя грамадзянскай вайны* [6, с.114].

Не менш устрывожаны паэт і яшчэ адной пагрозай – "вайна набліжаецца з захаду, як навальніца". У дзённіку з'яўляюцца трывожныя радкі перасцярогі, абурэнне бяздумнай слепатою тых, хто не бачыць, якую небяспеку нясе фашызм.

20/VIII. *Вайна ўжо грукае ў вароты. Аб гэтым пачынаюць гаварыць нават палітычныя глухары і сляпцы. Толькі на нашым Парнасе ўсё яшчэ працягваюцца нудныя спрэчкі* [6, с.311].

І ўжо праз некалькі дзён наступны запіс:

2/IX. *Учора пачалася вайна. Пачалася яна далёка ад нас, але ніхто не знае, дакуль дакоціцца яе полымя... Мне здаецца, што гэта вайна павінна перарасці ў вайну супроць фашызму, і не толькі нямецкага. І, зразумела, мы будзем і ў ёй удзельнічаць* [6, с.317]. Трагічна і прарочa гучаць метафарычныя радкі паэта, бо на сённяшні дзень усім вядома, дакуль "дакацілася" гэта полымя вайны і колькі ахвяр паглынула.

Шмат запісаў прысвечана падзеям у яго нарачанскім краі і нацыянальна-вызваленчаму руху. Максім Танк многа піша пра паўстане ў 1935 годзе нарачанскіх рыбакоў. З радкоў дзённіка вынікае, як задумвалася паэма "Нарач", як даводзілася перахоўваць лісткі рукапісаў, каб паліцыя не знайшла іх і аўтар зноў не апынуўся за кратамі. Проста на старонках дзённіка запісвае ён радкі, якія нараджаюцца, калі разважае пра нарачанскія падзеі:

*Не за ваду мы пачалі змагацца,*
*Але за тое, хто гаспадаром*
*З нас будзе тут...*

Прыцягвае ўвагу запіс 17 верасня. Ён напоўнены аптымізмам, бо за ім крыецца значная падзея, пачнецца новы этап у жыцці паэта і новы перыяд у творчасці:

17/IX. *Не знаю, з чаго нават пачынаць запісваць падзеі гэтага дня. Хіба – з усходу сонца, якое хоць і дакладна ўзышло па календары, але гэта ўжо быў каляндар новага жыцця. Слабадскія хлопцы першыя пачулі па радыё і прывезлі мне гэту радасную вестку, што Чырвоная Армія перайшла граніцу і ідзе вызваляць Заходнюю Беларусь.*

Неўзабаве, паведамляе дзённікавы запіс, створана Часовае ўпраўленне Вільні, а ў ім сфарміраваны аддзел культуры і асветы. Максіма Танка запрашаюць працаваць у рэдакцыю газеты "Віленская праўда". Паэт вельмі ўзрадаваны, што нарэшце зможа рэалізаваць свае творчыя задумы.

11/X. *Да гэтага я працаваў у невялічкіх нашых газетах, дзе ўвесь штат складаўся з двух-трох добраахвотнікаў, якія былі і адміністратарамі, і пісалі, і вычытвалі, і рассылалі сваю газету, а тут такі размах... Мы ішлі па Вільні першы раз такія акрыленыя і шчаслівыя* [6, с.331].

Ужо наступны запіс паведамляе аб передачы Вільні Літве, аб пераводзе паэта ў Вілейку, дзе будзе працаваць рэдакцыя газеты. Неўзабаве з Вілейкі Танка запрашаюць у Мінск на сустрэчу з пісьменнікамі, і ён знаёміцца з Купалам, Коласам, Бядулем, Лыньковым, які прапануе паэту перабірацца ў сталіцу, але той вагаецца – "і тут спраў – непачаты край".

28/XI. (апошні лісток у "Лістках календара") *Усё радзей і радзей бяруся за пяро, каб прадоўжыць свае нататкі. Сённяшні дзень запоўніў нават мінулае. Верасень пралёг граніцай паміж тым, што было і што ёсць* [6, с.351].

З запісаў відавочна, што асноўным тэматычным стрыжнем дзённіка Максіма Танка з'яўляюцца гістарычныя падзеі, яны падаюцца ў храналагічным парадку і як бы нанізваюць на сябе ўсю зместавую прастору. Але аўтар не проста фіксуе іх, а аналізуе, ацэньвае, выяўляючы свае гуманістычныя пазіцыі.

У дзённіку Максіма Танка значная ўвага надаецца гістарычным падзеям – гэта скразная тэма, і менавіта ад яе адгаліноўваюцца іншыя тэматычныя напрамкі, а ў іх межах усё, што ўплывала на жыццё грамадства, яго асабістае жыццё, абуджала развавагі.

Знайшла адлюстраванне ў дзённіку тэма барацьбы народа за справядлівасць, свабоду і паляпшэнне ўмоў жыцця. Аўтар піша:

17/I, 1939г. *А класавыя супярэчнасці ўсё больш і больш даюцца ў знакі. І іх не спыніць ні крапілам, ні кайданамі, ні штыкамі, ні вялікадзяржаўнымі прамовамі розных паноў... Людзі чакаюць рэформаў. Дрэнна абстаіць справа і з асветай... Цяпер і на вёсцы атмасфера вельмі напружаная, як перад нейкай навальніцай.* [6, с.240].

Паэт часта наведваецца да бацькоў у Пількаўшчыну, каб дапамагчы па гаспадарцы, і адзначае, што тут больш здаровых сіл, жыццёвай трываласці. Ад гэтага "*становішся дужэйшым, пачынаеш больш упэўнена хадзіць па зямлі*", - зазначае аўтар. Яго шанаванне сялянскага побыту, мудрасці, традыцый адлюстроўваецца з асаблівым замілаваннем ў многіх радках дзённіка. Так, напрыклад, піша ён пра дзедаву сяўню:

30/VIII. *З ёю ён кожны год, апрануўшы новую кашулю, нашча, з сонцам выходзіць на сваю спрадвечную працу сейбіта. Прайшоўшы з канца ў канец усё поле, ён потым, як нешта святое, перадае сяўню майму бацьку* [6, с.316].

З вялікай цеплынёй піша Максім Танк пра сям'ю, пра яе ролю ў жыцці чалавека і асабліва пра маці, сардэчная чуласць якой мае глыбокія нацыянальныя вытокі і праяўляецца ва ўсім – нават у малітве. І прыклад таму ён бачыць у сваёй маці.

8/IX. *Маці пачынае шаптаць свае пацеры. Пацеры ў яе бясконцыя. Яна моліцца за кожнага з нас, моліцца за жывых і памерлых, за хату і зямлю, за ўсіх людцаў на свеце. Такой малітвы я нідзе не чуў, як малітва маёй маці...* [6, с.320].

У гэтых запісах выяўляецца арганічная злучанасць паэта з народным жыццём, яго чуйная ўвага да сялянскіх клопатаў і працы на зямлі, да выпрацаваных вякамі маральных каштоўнасцей. У дзённікавых запісах ён выказвае думку, што своеадметнасць беларусаў праяўляецца ва ўсім: у буднях і ў святах. Падрабязна апісвае велізарны віленскі фэст – "Казюкі", свята-кірмаш рамеснікаў, сімвалам якога тут з'яўлялася "казюкава сэрца", сэрца сятога Казіміра, апекуна рамеснікаў.

Неад'емнай тэматычнай часткай дзённікавых запісаў Танка з'яўляюцца замалёўкі прыроды, яны настраёвыя, сугучныя ўнутраным адчуванням і падаюцца вобразна, філасафічна і маюць сэнсава ёмісты змест:

3/V. *За плотам разлапушыўся куст грэцкага арэха, што вырас з зярняці, пасаджанага дзядзькам Фадзеем. Куст гэты кожную зіму вымярзае, але кожную вясну зноў выпускае маладыя атожылкі, пакрытыя шырачэзнымі цёмна-зялёнымі лістамі. Нешта ёсць у яго характары з нашай мужыцкай упартасці. Можа, таму ніхто яго не чапае. Хай далей змагаецца з нашымі халадамі. Можа, з часам абжывецца, прывыкне, будзе неяк жыць* [6, с.29].

У "Лістках календара" шырока падаецца панарама культурнага жыцця Вільні. Максім Танк піша, што ніколі не пустуюць у горадзе кінатэатры, асабліва "Пан", "Гэліос", "Касіно". Піша пра захапленне фільмам "Маскоўскія ночы" А. Граноўскага, як цяжка было дастаць білеты на фільм "Анна Карэніна" і як пакарыла ўсіх Грэта Гарбо сваім выкананнем ролі галоўнай гераіні цудоўнага рамана Льва Талстога. *"У "Гэліосе" ідзе новы фільм Чарлі Чапліна "Новы час". Народу – не прабіцца. Так ён захапіў віленскіх прыхільнікаў кінамастацтва",*- зазначаецца ў дзённіку. Паэт шчыра

ўсцешаны, што мастацтва аб'ядноўвае людзей, садзейнічае паразуменню і прагрэсу. Пацвярджэнне гэтаму ён бачыць у захапленні шырокай грамадскасці юбілейнай выставай фотаздымкаў прафесара Яна Булгака, пастаноўкамі ў тэатры "Рэдута" несмяротнага "Рэвізора" М.В. Гогаля, і інш. Праз шматлікія запісы ў дзённіку аўтар расказвае пра дзейнасць музеяў (асабліва беларускага музея І. Луцкевіча), бібліятэк, культурных суполак, таварыстваў, прыдае ім вялікае значэнне:

10/V. *Днямі мне ўдалося пабываць у музеі "Таварыства сяброў навукі" і там упершыню пабачыць карціну Чурлёніса "Бура". Над уздыбленымі хвалямі мора – цяжкія хмары, якія нагадваюць званы. Аж, здаецца, чуваць у залах іх набатны гул"* [6, с.34].

З захапленнем расказвае Максім Танк пра свае сустрэчы з унікальным мастаком Язэпам Драздовічам, які першым у беларускім мастацтве звярнуўся да касмічнай тэмы, стварыў графічныя партрэты знакамітых князёў, замалёўкі старажытных замкаў. У дзённіку ён адзначае, што карціны Драздовіча *"не толькі здзіўляюць сваім новым бачаннем свету, але змушаюць задумацца над тым, яшчэ не разгаданым, што акружае чалавека. Зарысоўкі ж яго народных тканін, дываноў, паясоў – рэдкі скарб, якому некалі і цаны не будзе "* [6, с.200].

Яшчэ адна тэма, якая хвалюе паэта – гэта тэма адукацыі. Недастаткова было школ, нават польскіх, не па кішэні было і навучанне ў гімназіі: 220 злотых у год. Шмат непісьменных, якія з-за гэтага не змогуць рэалізаваць сябе ў поўнай меры. Гэта думка асабліва трывожыла аўтара, што адлюстравалася ў многіх запісах.

20/II. *Дзед з пашанай ставіўся да пісання. Часамі мог доўга сядзець і глядзець, як нехто піша... Можа, шкадаваў, што сам не мог пакінуць на паперы пражытага, сваіх ведаў, цяжка здабытай сялянскай мудрасці... А расказчык з яго – адменны. Тое, што ён расказваў, нагадвала прытчы пра звяроў, пра хлеб, пра зло і дабро* [6, с.186].

У прадмове да дзённіка Максім Танк напісаў, што па вядомых прычынах (пастаянны нагляд паліцыі, вобыскі) ён не мог, каб не нашкодзіць таварышам, пісаць іх прозвішчы. Абыходзіўся скарачэннямі, клічкамі, псеўданімамі. Напрыклад, сваю дзяўчыну, будучую жонку Любоў Андрэеўну Асаевіч, у дзённіках упамінаў як Лю. Дарэчы ёй прысвячаюцца самыя светлыя і сардэчныя радкі дзённіка. Яны пасябравалі яшчэ ў віленскай беларускай гімназіі, вымушаны былі разлучыцца на два гады:

дзяўчына працавала па заданні КПЗБ у Варшаве. Ізноў сустрэўшыся, яны ўжо не разлучаліся ўсё жыццё.

Часта сустракаецца ў дзённіках імя "дзядзька Рыгор" – гэта Рыгор Шырма, харавы рэжысёр, стваральнік белрускага народнага хору, збіральнік народных песень, які апекаваўся маладым паэтам. Ён быў і настаўнікам, і дарадцам у творчасці, запрашаў на цікавыя імпрэзы, знаёміў з творчымі людзьмі, дапамагаў надрукавацца.

8/VI. *Дзядзька Рыгор падабраў пару маіх вершаў для К. Галкоўскага, які хоча напісаць на іх музыку. Перагледзеў тэксты і папрасіў зрабіць іх больш пявучымі* [6, с.265].

На шчасце, такіх руплівых стваральнікаў нацыянальнай культуры на жыццёвай сцежцы Максіму Танку сустрэлася нямала. Яны дапамагалі паэту вытрымліваць суровыя выпрабаванні. А ён, назіраючы за рознымі праявамі жыцця грамадства, кантактуючы з рознымі людзьмі, запісваючы найбольш значнае ў дзённіку, імкнуўся адлюстраваць праўдзівы воблік часу, па-філасофску асэнсаваць усё, скласці сваю жыццёвую пазіцыю.

Яшчэ адзін тэматычны вектар – гэта творчасць, што ярка прасочваецца ў дзённікавых запісах Максіма Танка, дзе ён выказвае думку, што грамадзянская пазіцыя пісьменніка абавязкова знаходзіць адлюстраванне ў яго творчасці. Асэнсаванне ж праблем чалавечага быцця актывізуе творчасць і мастацкія пошукі.

Максім Танк дзеліцца сваімі думкамі з сябрамі. Гэта Яворскі, Путрамант, Каросас – польскія і літоўскія паэты, чытае Куляшова, Маякоўскага, Рэмбо, Рыльке і інш. Часта сустракаюцца ў дзённіку словы "праседзеў у бібліятэцы", "адкрыў яшчэ адну не знаную для мяне краіну паэзіі", "раблю выпіскі" – усё гэта творча ўзбагачае паэта, дае адказы на многія пытанні.

10/VI. *Паэзія павінна адкрываць новае. Інакш яна перастане быць паэзіяй. А новае трэба шукаць на жыццёвых шляхах не толькі свайго, але і іншых народаў* [6, с.267].

Паэт прызнаецца, што цікавіцца рознымі літаратурнымі школамі і напрамкамі, але асцерагаецца, каб не трапіць на "пусты" шлях. Прывабліваюць яго новыя формы, вобразы і надзвычай зацікавілі творы, што будуюцца на рытме. *"Я яшчэ адбіваю паклоны рыфмам, але яны мне пачынаюць здавацца не такімі патрэбнымі",*- прызнаецца паэт і як доказ занатоўвае верш "Наймаючыся на працу":

*Вы пытаецеся, што я патраплю рабіць,*

............

*Выбачайце, што вас я патурбаваў,*

*Я – чалавек, які толькі ўмее*

*З грудкі зямлі здабываць хлеб,*

*З сэрца свайго – песні* [6, с.248].

З пазіцый сённяшняга часу можна меркаваць, што гэта былі першыя крокі да верлібра, які паэт так плённа ўвёў у беларускую паэтычную палітру.

Разам з тым, паэт цвёрда ўпэўнены, што нельга ігнараваць спадчыну, здабыткі папярэднікаў, і называе Адама Міцкевіча, Максіма Багдановіча, Цётку, Янку Купалу, Якуба Коласа.

Максім Танк з глыбокай павагай ставіцца да фальклору, ён тонка адчуваў і ўспрымаў фальклорныя матывы, паэтыку, тыпізацыю.

2/II. *Зноў узяўся за фальклор. Колькі тут нявыкарыстаных скарбаў. Я часта вяртаюся да яго як да крыніцы, каб асвяжыць свае вусны* [6, с.183].

У "Лістках календара" сустракаюцца шматлікія занатоўкі прыказак, паданняў, сюжэтаў народных аповедаў, песень. Асабліва шмат іх пачута ад дзеда. Напрыклад, паданне пра асілка Вяля стала сюжэтам для Танкавай паэмы Сказ пра Вяля". Увогуле дзённікавыя запісы даволі часта перамяжоўваюцца з літаратурнымі тэкстымі. Аўтар цытуе радкі прачытаных твораў розных аўтараў, аналізуючы іх і выказваючы сваё ўспрыняцце або падае ўрыўкі са сваіх твораў з развагамі аб іх дасканаласці ці недахопах, стараючыся такім чынам як бы паглядзець на іх збоку, староннім вокам. Гэта сведчыць аб высокай патрабавальнасці да мастацкіх твораў як чужых, так і сваіх. Часам ён сумняваецца, але працягвае пошукі:

17/I. *І ўсё ж трэба пісаць. Паэзія мая, калі яна сапраўдная, здольная адкрываць неадкрытае, адказваць на пытанні жыцця, не абмінаючы іх* [6, с.241].

Але пісанню не спрыялі ўмовы, трэба было нешта пісаць, каб зарабіць на жыццё, цяжка было ствараць, бо быў пад пільным наглядам паліцыі. Кнігі і рукапісы канфіскоўвалі. Перыядычна ў дзённіку з'ўляліся такія запісы:

31/VII. *Грукаюць у дзверы. Паліцыянты гурбою ўваліліся ў пакой.Ператрэслі мае кнігі, паперы. Нічога не знайшлі. Спыталі, як даўно працую ў рэдакцыі "Нашай волі". Пасля такой рэвізіі чуюся нейкі разбіты, хоць, здаецца, пара было б прызвычаіцца да падобных візітаў* [6, с.113].

Відавочна, што занатоўваючы храналогію падзей свайго жыцця, Максім Танк імкнецца аб'ектыўна ацаніць перажытае і зробленае. А таму і дзённікавыя запісы пры ўсёй іх разнастайнасці аб'ядноўвае адно – аналітычнасць і шчырасць, якія адлюстроўваюць думкі, пачуцці, светаразуменне аўтара – таленавітага і самабытнага паэта.

## Заключэнне

Дзённік Максіма Танка "Лісткі календара" – гэта яркі прыклад пісьменніцкага дзённіка, які спалучае ў сабе знешнія прыкметы гэтага жанру (датаванасць, перыядычнасць вядзення, храналагічнасць) і спецыфічныя прыкметы – гэта політэматычнасць, фіксацыя змен, якія адбываюцца ў грамадстве, роздум на філасофскія тэмы, асэнсаванне сябе як пісьменніка і сваіх творчых пошукаў. Тут ёсць і фактаграфічныя запісы, блізкія да рэпартажаў, і яркія замалёўкі, і ёмістыя разважанні, і невялікія публіцыстычнага ці лірычнага характару эсэ.

Уся зместавая прастора запісаў абагульняецца скразной гістарычнай тэмай, якая раскрывае асаблівасці сацыяльна-палітычнага і культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі, пераважна ў Вільні, з 1935 па 1939 год.

Камунікатыўная мэта дзённіка паэта – гэта, з аднаго боку, падаць інфармацыю аб гістарычных падзеях, якія адбываліся ў той час, а з другога боку, асэнсаваць гэту інфармацыю, прааналізаваць, даць сваю ацэнку.

З дзённікавых запісаў вынікае, што аўтара вельмі хвалююць палітычныя падзеі, пагроза вайны, якая ўплывае на ўсе сферы жыцця. Не менш увагі надаецца і нацыянальна-вызваленчаму руху, у якім паэт прымаў актыўны ўдзел, а таксама ўз'яднанню Беларусі. Увогуле ж дзённік політэматычны. Закранаюцца тэмы культурнага жыцця, адукацыі, сям'і, прыроды, маральных каштоўнасцей і інш.

Максім Танк апісвае рэальныя выпадкі з уласнага жыцця, успаміны, важныя для яго эпізоды, сустрэчы з сябрамі, пісьменнікамі, мастакамі, дзеячамі культуры. Згадваюцца прозвішчы Якуба Коласа, Язэпа Драздовіча, Рыгора Шырмы і інш. Відавочна, што дзённікавыя занатоўкі жывяцца вельмі асабістым і асэнсоўваюцца праз філасофскае разважанне - гэта бескампрамісны дыялог з самім сабой.

Значнае месца ў дзённікавых запісах займае роздум аб творчасці, аб паэзіі, аб традыцыях і наватарстве, аб прачытаных кнігах. Аўтар цытуе радкі з твораў пісьменнікаў, якія яго кранулі, а таксама запісвае на старонках дзённіка ўрыўкі са сваіх паэм, вершаў, каб праілюстраваць творчыя пошукі, асабістыя думкі і погляды.

З вышэй сказанага вынікае, што дзённік Максіма Танка "Лісткі календара" мае інфарматыўна-аналітычны характар, бо акрамя асноўнага – інфарматыўнага

зместу ён мае і аналітычны напрамак у выглядзе філасофскіх і ацэначных разважанняў. Гэта каштоўнае аўтэнтычнае сведчанне гістарычнага часу і ўласнай біяграфіі паэта.

## Спіс літаратуры

1. Бугаёў, Д.Я. Паэзія Максіма Танка / Дзмітрый Бугаёў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 311 с.

2. Мы жылі ў буднях барацьбы : старонкі ваенных дзённікаў беларускіх пісьменнікаў; уклад., прадм., уступ. арт., камент. Ганны Запартыкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2020. – 366 с.

2. Іўковіч, М. Захаваць дзённікі пісьменнікаў / М. Іўковіч // "ЛіМ". 2020. - № 16 – С.3

3. Новік.Г.Ю. Жанравыя адметнасці сучаснага вясковага дзённіка / Г.Ю. Новік // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: зб. навук. прац / рэдкал. : А.С. Садоўская (адк. рэд.) –Гродна : ЮрСаПрынт, 2017. – 326с.

4. Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік : тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў/ В. П. Рагойша. – Мінск : Нар. асвета, 2009. –. 303с.

5. Танк, М. Збор твораў. У 6-ці т. Т. 6 : Дзённікі, літаратурна-крытычныя артыкулы/ Максім Танк.— Мінск : Мастацкая літаратура, 1981. — 636 с.

6. Шлях да ўзаемнасці = Drogakuwzajemnosci: матэрыялы XXII міжнар.навук. канф.(Гродна, 28 кастр. 2016г.) /рэдкал.: Я.Панькоў – Гродна: Гродзенская друкарня, 2017.–248с.